л ?6

МОЗЫРСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ИНСТИТУТ
ИМЕНИ Н.К. КРУПСКОЙ

# ПСИХОАОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЯ В УСЛОВИЯХ РЕФОРМИРОВАНИЯ ОБЩЕОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ И ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ



**Материалы**
**Международной**
**научно-практической конференции**
**28-29 ноября 2001 года**

**Часть 1**

**Мозырь 2002**

Репозиторий БарГУ

**МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ**
**МОЗЫРСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ ИНСТИТУТ**
**ИМЕНИ Н.К. КРУПСКОЙ**

# ПСИХОЛОГО-ПЕДАГОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЯ В УСЛОВИЯХ РЕФОРМИРОВАНИЯ ОБЩЕОБРАЗОВАТЕЛЬНОЙ И ВЫСШЕЙ ШКОЛЫ

Материалы Международной научно-практической конференции
- 28-29 ноября 2001 года

*Под общей редакцией*
*доктора биологических наук, профессора В.В.Валетова*

**Часть 1**

**БИЬЛ' '''''ТЕКА**

**, И. К. аРУПСШ**

**Мозырь 2002**

Репозиторий БарГУ

она еще полноправно не вошла в устоявшееся педагогическое образование, особенно в практику подготовки педагогических кадров. Вместе с тем современный этап развития образования, насущная необходимость международного и межгосударственного обмена в области информации и образования требует введения курса «Сравнительная педагогика» в план учебного процесса педагогических учебных заведений. Используя накопленный опыт кафедрами педагогики БГПУ им. М.Танка, РИВШ БГУ введен в структуру цикла педагогических дисциплин спецкурс «Сравнительная педагогика». Студенты, магистранты и аспиранты знакомятся с зарубежным опытом образования, имея возможность сравнивать его с отечественными преобразованиями в обучении и воспитании. Кроме того, в НИО МО Беларуси работает лаборатория по сравнительному образованию. Исследуя зарубежные системы образования (США, Германки, Великобритании, Франции, Японии и др.), становление и развитие образовательных реформ в Беларуси, странах СНГ, сотрудники лаборатории готовят доклады, статьи, участвуют в конференциях, издают монографии. Это дает положительный эффект в выявлении новых моделей образования, прогнозировании путей его дальнейшего развития.

## Литература


1. Deutschland, 2001 ,№ 1. S. 54.
2. Adicik Christel: Gegenstand und Reflexionsebenen der International und Interkulturell Vergleichenden ErziehungswrissenschafL In: Adick U. a.: Was ist Erziehungswrissenschaft? Festschrift fur Peter Menck. Donauworth. 2000, S. 67-95.
3. Von Корр. Botho: Jungste Fendenzen in der vergluchenden Erziehungswissenschaft. Unveroffentliches Manuskript. Deutsches Institut fur Internationale Padagogische Forschemg am 19 Juni. 2000. Frankfurt am Main
4. «Настаўнодкая газета», №№ 128(6.11), 129(10.11), 130(13.11), 131 (15.11). 2001



A.L Барадзіна (Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж)


# АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫЯ КАШТОЎНАСНЫЯ АРЫЕНТАЦЫІ Ж АСНОВА СВЕТАПОГЛЯДУ НАСТАЎНПСА ЛІТАРАТУРЫ

Зварот сучаснага грамадства да агульначалавечых каштоўнасцей абумоўлены сацыяльна-палітычнымі працэсамі, што адбываюцца на постсавецкай прасторы ў апошнія дзесяцігоддзі. На змену партыйнай монаідэалогіі прыйшла новая ідэалагічная сістэма, якая не проста дэкларуецца, а паступова ўкараняецца ў разнастайныя сферы духоўнай



Репозиторий БарГУ

**жыццядзейнасці грамадства. Школьнае навучанне і выхаванне - дакладная мадэль праблем і супярэчнасцей дзяржавы, а навучальныя праграмы - адбітак грамадскіх адносін. Сучасныя школьныя праграмы выяўляюць прынцыпова новую мадэль курса літаратурнай адукацыі. Сфера зацікаўленасці літаратуразнаўчай навукі зараз - чалавек, чалавеказнаўства і чалавекатварэнне, гуманізм. Аднак гэта не азначае толькі пераарыентацыю ў палітычных прыярытэтах. Курс літаратуры ў школе скіраваны на агульначалавечыя маральна-эстэтычныя і гуманістычныя мастацкія каштоўнасці, якія ёсць вынік прысваення чалавекам "чалавечай сутнасці" ўсяго духоўнага багацця, што яму папярэднічае. Рэалізацыя прынцыпу гуманізацыі ў выхаваўчым працэсе якраз і азначае фарміраванне агульначалавечых капггоўнасных арыентацый. "Агульначалавечыя каштоўнасці - гэта гранічныя, гістарычна і сацыяльна нелакалізуемыя каштоўнасці, якія носяць абсалютны характар... Выхаванне моладзі ў духу гэтых каштоўнасцей ва ўсе вякі і ва ўсіх народаў лічылася абавязкавай умовай яе сацыялізацыі" [5, 255]. -**

**Сутнасная характарыстыка паняцця гуманізацыі ўключае і такі яго бок, як разумение сучаснага грамадства ў якасці "формы культурна-гістарычнай пераемнасці, сувязі розных эпох праз культурныя традыцыі і дасягненні чалавечай творчасці, праз разнастайныя тылы менталітэту" [4,7].**

**Агульначалавечае заўсёды рэалізуецца праз канкрэтначалавечае, а кожны канкрэтны чалавек ёсць грамадзянін той ці іншай дзяржавы, прадстаўнік пэўнага народа, нацыі. Выхаванне асобы з агульначалавечых пазіцый не выюпочае павагу да традыцый і законаў сваей краіны, любоў да яе, патрыятызм, выхаванне грамадзянскай адказнасці.**

**Такім чынам, фарміраванне свядомасці і самасвядомасці асобы павінна абапірацца на агульначалавечыя каштоўнасці, актуалізуючы і развіваючы ўсё лепшае, што маецца ў вопыце кожнай краіны, кожнага народа. Гуманістычна арыентаваная свядомасць ёсць не што іншае як духоўнасць. А "мера духоўнага развіцця асобы - гэта тая ступень, у якой асоба можа прадстаўляць свой час, свой народ, нацыянальную культуру, этнас і соцыум" [1, 64 - 65].**

**Духоўнасць выступае як спосаб самапабудовы асобы. Выхаваць духоўнасць - значыць далучыць да гуманізму: да ісціны, дабра, прыгажосці, карысці ў іх дыялектычным адзінстве. Рэалізацыі гэтых мэт у найболыпай ступені могуць садзейнічаць такія вучэбныя прадметы, як родная літаратура, гісторыя, грамадазнаўства, якія з'яўляюцца сродкам развіцця асобы, асновай для яе арыентацыі ў рэчаіснасці і для дзейнасці ў пэўных умовах жыцця. Рэальна развіццё кожнай асобы абапіраецца на вопыт папярэдніх пакаленняў і ўлічвае яго. Таму літаральнае паўтарэнне асобай шляху грамадскага развіцця не з'яўляецца неабходным. Аднак для таго, каб чалавек, які расце, стаў нароўні з грамадскім развіццём, індывід**

Рэпазіторый БарДУ

павінен асвоіць паслядоўна стадыі развіцця культуры, якія чалавецтва прайшло да яго нараджэння. У гэтым сэнсе курс гісторыі літаратуры аказваецда абавязковым.

"Мастацтва само ёсць і каштоўнасць, і спосаб асваення, і спосаб фарміравання каштоўнасцей, а значыць, і спосаб перабудовы жыццеадносін, матываў жыццядзейнасці" [2, 66 - 67]. На ўроках літаратуры праз змест і сродкі навучання школьнікі ўключаюцца ў дзейнасць па асэнсаванні такіх каштоўнасцей [1], як этнамова, гісторыя Айчыны, прырода роднага краю, фальслор і нацыянальнае мастацтва, народны каляндар, нацыянальная сімволіка і геральдыка, сямейна-бытавая культура, вывучэнне радаводу, нацыянальна-гістарычнай маралі, этыкету, адзення, побыту, народных традыцый, нацыянальнага характару.

Як бачым, агульначалавечыя каштоўнасныя арыентацыі з'яўляюцца падмуркам розных пластоў свядомасці і самасвядомасці асобы, у тым ліку і нацыянальнай свядомасці. А менавіта нацыянальная свядомасць - важнейшы складнік светапогляду выкладчыка беларускай літаратуры. Без асваення гуманістычных каштоўнасцей немагчыма і фарміраванне патрыятычнай, грамадзянскай, экалагічнай свядомасці.

Між тым, нягледзячы на бясспрэчную важнасць праблемы, пастаўленай самім часам, якасць яе вырашэння пакідае жадаць лепшага. Праведзенае намі апытанне студэнтаў другога курса лінгвістычнага факультэта (а менавіта з гэтага курса яны пачынаюць вывучаць гісторыю літаратуры) выявіла недастатковае валоданне імі зместам паняцця "агульначалавечыя каштоўнасці", што, безумоўна, вынікае з недахопу ўвагі да дадзенай праблемы школьных настаўнікаў літаратуры. Каб пазбегнуць развіцця "ланцуговай рэакцыі", неабходна надежным чынам паставіцца да асйаення сістэмы гуманістычных каштоўнасцей студэнтамі - будучымі выкладчыкамі роднай літаратуры.

У 90-ыя гады мінулага стагоддзя была зроблена наступная спроба класіфікацыі вызначальных агульначалавечых каштоўнасцей [3], на якую мы і абапіраліся, праводзячы даследаванне: Зямля - наш агульны дом, прырода, Радзіма, мова, гісторыя, праца, любоў, сям'я, годнасць, мір, свабода... Вынікі апытання наступныя: з 73 рэспандэнтаў Зямлю і мір у якасці агульначалавечых каштоўнасцей не ўсведамляе ніхто, прыроду - 2 (2,7%), Радзіму - 4 (5,5%), мову - 13 (17,8%), гісторыю - 3 (4,1%), сям'ю - 3 (4,1%), працу - 1 (1,4%). Першае рэйтынгавае месца займае такая гуманістычная каштоўнасць, як каханне - 15 (20,5%). Гранічныя, сацыяльна і гістарычна значныя каштоўнасці, як правіла, падмяняюцца апытваемымі больш вузкімі, прыватнымі маральнымі якасцямі асобы, такімі як дабрыня, узаемадапамога, міласэрнасць і інш. Не адмаўляючы іх вартаснасці ў структуры асобы і выхаваўчай значнасці ў мастацкай тканіне твораў, важна ўсё ж не дапускаць 'падмены паняццяў, паколькі агульначалавечыя каштоўнасці ёсць не толькі аснова грамадскай



Рэпазіторый БарДУ

ідэалагічнай сістэмы, але і метадалагічная аснова аналізу літаратурных твораў на сучасным этапе. Зварот да гэтай сістэмы дазваляе пераадолець і такі недахоп літаратурнай адукацыі, як збедненасць філасофскіх аспектаў у падыходзе да літаратурных з'яў. Прычым сказанае датычыць не толькі твораў сучаснай літаратуры, нядаўна ўключаных у школьныя праграмы, але і твораў класічных, "абкатаных", аднак, разам з тым, і абцяжараных за дзесяцігоддзі сацыяльна-палітычнай інтэрпрэтацыяй. Так, напрыклад, аптымальным і эфектыўным сцвердзіўся ў практыцы аўтара такі крытэрый аналізу паэмы Якуба Коласа "Новая зямля", як агульначалавечы змест твора, што дазволіла на добра знаёмую мастацкую з'яву паглядзець з новага пункту погляду.

Змест літаратуры як вучэбнага прадмета дае шырокія магчымасці як для асваення філасофскай сутнасці паняцця агульначалавечых каштоўнасцей, так і для трансфармацыі гэтага феномена ў феномен педагагічны, дыдактычны і выхаваўчы. Фарміраванне гуманістычных каштоўнасных арыентацый у такім выпадку патрабуе ўзмацнення эмацыянальна-афектыўнага аспекту навучання, што цалкам адпавядае эстэтычнай прыродзе літаратуры. Пераарыентацыя адукацыі на чыстае навучанне недалушчальнае на фоне агульнай нестабільнасці жыцця, тэндэнцыі да падзення ўзроўню выхаванасці і росту бездухоўнасці моладзі. Апасродкаваныя праз эстэтычны змест літаратурнага твора пры дапамозе катэгорый трагічнага, узвышанага, гераічнага, агульначалавечыя каштоўнасці выступаюць як магутны фактар фарміравання асобы.

## Літаратура


1. Валадзько У.Ф. Выхаванне школьнікаў.- Мн.: ША, 1993.
2. Івашын В.У. З пазіцый гуманізму. Тэарэтыка-метадалагічныя і метадычныя праблемы літаратурнай адукацыі.- Мн.: ША, 1998.
3. Караковский В.А. Стать человеком. Общечеловеческие ценности - основа целостного учебно-воспитательного процесса.- М., 1993.
4. Лявонава ПЛ. Настаўнік літаратуры і культура: Культуралагічны аспект удасканалення прафесійнай падрыхтоўкі — MR., 1996.
5. Психология и педагогика: Уч. пособие для вузов /Под ред. Радугина А.А.-М., 1996.


Рэпазіторый БарДУ

**завоевании ими доверия людей, вне которого они недееспособны как управленцы.**

**СОДЕРЖАНИЕ**

*1. ТЕОРЕТИКО-МЕТОДОЛОГИЧЕСКИЕ ОСНОВЫ ПРОФЕССИОНАЛЬНОЙ ПОДГОТОВКИ УЧИТЕЛЯ*

1. **Андреев В.И. (РИВШ БГУ, г. Минск) О месте сравнительной педагогики в теории и практике современного образования** 4
2. **Барадзіна А.І. (г. Баранавічы) Агульначалавечыя каштоўнасныя арыентацыі як аснова светапогляду настаўніка літаратуры** 12
3. **Гимбут В.В. (г. Мозырь) Мероприятия по подготовке и повышению квалификации учителей школ национальных меньшинств в БССР в 1920-ые годы** 16
4. **Годлевская А.Н., Котлярова М.М. (г.Гомель) О некоторых проблемах подготовки педагогов в условиях реформирования образования** 20
5. **Евдокименко Н.Л. (г.Гродно) Личностное самоопределие учителя** 23
6. **Зинькова Н.К. (г.Витебск) Пути формирования историко-педагогической культуры будущего учителя** 27
7. **Иванов С.А., Дворак В.Н. (г.Гомель) Теоретико-методические аспекты применения технологии модульного обучения" в системе профессионально-педагогического образования.** 30
8. **Комонова А.В. (г. Мозырь) Этико-педагогические идеи Георгия Конисского** 32
9. **Краўчонак М.М (г.Мазыр) Менталітэт народа як зыходная аснова нацыянальнай педагагічнай сістэмы** 34

**Ю.Кухарев Н.В. (г. Гомель) К вопросу о подготовке педагога-исследователя в системе повышения квалификации: акмеологический подход** 36

**П.Лабанок В.А. (г.Магілеў) Тэаретыка-метадалагічная падрыхтоўка настаўніка да працы ва ўмовах міжпрадметнай інтэграцыі.** 39

**12.Левко А.И. (г. Минск) Ценностно-нормативные основы подготовки учителя для реформируемой школы.** 42

**13.Лукашеня З.В. (г. Барановичи) Теоретико-методологические аспекты - технологизации профессиональной подготовки учителя технологии** 46

**14.Молчан Э.М. (г. Мозырь) Ценность — феномен бытия** 52

Репозиторий БарГУ